***П.Л. Дзям'ян***
БГУ (Минск)

# ВАЙСКОВА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КАНСТАНЦІНА ПАКЛОНСКАГА НА ЗЕМЛЯХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ПАДЧАС ВАЙНЫ 1654-1667 ГГ.

Асоба ў гісторыі, калі гэта не манарх ці інтэлектуал, нараджаецца вайной. У жэрале канфлікту адбываецца яе гераізацыя і часцей за ўсё міфалагізацыя. 1654-1667 гады сталі сапраўднай катастрофай для зямель Вялікага Княства Літоўскага. Вынікам ваенных дзеянняў стаў эканамічны заняпад, вялізарныя людскія страты, палітычны і ідэалагічны крызіс.

Менавіта падчас гэтага ваеннага ліхалецця на гістарычнай арэне з'явілася постаць пінскага шляхціча Канстанціна Паклонскага. Канстанцін Вацлаў Паклонскі сын Юр'я Паклонскага паходзіў з праваслаўнай шляхецкай сям'і. Радавое прозвішча Паклонскага сустракаецца і ў падвойным варыянце «Водзгір-Паклонскі».

З пачаткам вайны Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай К.Паклонскі пераходзіць на царскую службу і, карыстаючыся падтрымкай маскоўскага ўрада, стварае свой казацкі полк. Аснову якога склалі ў пераважнай большасці мясцовыя сяляне, мяшчане і невялікая колькасць шляхты. Пасля гэтага за адносна кароткі перыяд часу К.Паклонскаму ўдаецца заняць шэраг гарадоў на усходзе Вялікага Княства Літоўскага. Пасля таго як напрыканцы верасня 1654г. абаронцы Крычава здаліся маскоўскім войскам, канчаткова аформілася тэрыторыя, якую маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч перадаў пад часовы кантроль К.Паклонскага.

Ядро гэтых зямель склала Магілёўская эканомія з горадам Магілёвам і мястэчкам Чавусы, а таксама Крычаў і землі вакол яго. Менавіта гэтыя тэрыторыі і стануць месцам пастаяннага кватэравання казацкага палка К.Паклонскага.

Аднак ні наяўнасць свайго вайсковага атрада, ні хоць і абмежаваная, але падтрымка з боку Масквы не давалі К.Паклонскаму ўпэўненасці ў трываласці

свайго становішча. Прычынай для гэтага быў канфлікт паміж наказным гетманам Войска Запарожскага Іванам Залатарэнкам, які начале казацкага корпуса летам 1654г. ўступіў на тэрыторыю ВКЛ з мэтай падтрымкі маскоўскіх войскаў, і беларускім палкоўнікам (так з верасня 1654г. пачынае называць сябе К.Паклонскі ў лістах да цара).

Прычынай для канфрантацыі паслужыў факт перадачы К.Паклонскім занятага ім у жніўні 1654г. Магілёва пад маскоўскае кіраўніцтва. Гэты факт выклікаў моцную хвалю незадаволенасці з боку запарожскіх казакоў. Паколькі яшчэ ў перыяд народна-вызваленчага паўстання ва Украіне, якім кіраваў Багдан Хмяльніцкі, тэрыторыя беларускага Падняпроўя разглядалася казацкай старшынай як сфера прамых інтарэсаў Войска Запарожскага.

Узнікшы на гэтай падставе канфлікт паміж І.Залатарэнкам і К.Паклонскім трываў даволі працяглы час: пачынаючы з восені 1654г. і ажно да пачатку зімовай кампаніі войска ВКЛ. Гэты канфлікт прадэманстараваў той факт, што ўласных сілаў для супрацьстаяння запарожскім казакам К.Паклонскаму не хапае. Аднак ад поўнай паразы яго ўратавала, як ужо адзначалася вышэй, распачаўшаяся неўзабаве зімовая кампанія 1655г.

Не паглыбляючыся далей у перыпетыі адбываўшыхся падзей, трэба адзначыць, што ўжо ў лютым 1655г., падчас аблогі Магілёва войскамі вялікага гетмана Я.Радзівіла, К.Паклонскі разам з часткай свайго палка вярнуўся на бок Рэчы Паспалітай.

Зрабіўшы сціслы агляд вайсковай дзейнасці К.Паклонскага, звернемся да палітычнага складніка яго дзеянняў. У гэтай сувязі паўстаюць пытанні: ці існавалі ў К.Паконскага пэўныя больш значныя матывы яго дзейнасці або ён кіраваўся выключана ўласнымі інтарэсамі, ці можна яго дзеянні і дзеянні старшыны яго палка разглядаць як спробу стварэння пэўнага вайскова-палітычнага арганізма на ўсходзе ВКЛ?

Прааналізаваўшы гістарыяграфічны матэрыял і дакументальныя сведчанні аб дзейнасці К.Паклонскага, можна з ўпэўненасцю сцвярджаць наступнае: на тэрыторыі, якая кантралявалася палком К.Паклонскага, за

дастакова кароткі прамежак часу сфармавалася адміністрацыяна-тэрытарыяльная адзінка, якая сваім зместам фактычна адпавядала існаваўшым у складзе Войска Запарожскага палкавым абласцям. Гэта, а таксама іншыя факты (такія як самавольнае прыняцце К.Паклонскім тытула «палкоўніка беларускага», што павінна было значна павысіць аўтарытэт К.Паклонскага як сярод мясцовых жыхароў, так і ў вачах маскоўскіх улад), хаця і ўскосна, але з’яўляюцца пацверджаннем тэзіса аб узнікненні на тэрыторыі Магілёўшчыны пэўнага вайскова-палітычнага арганізма, які хоць і не атрымаў далейшага развіцця, але меў дакладныя дзяржаўніцкія рысы.

Такім чынам, можна меркаваць аб характары магчымага дзяржаўнага ўтварэння, якое магло паўстаць на падначаленых К.Паклонскаму тэрыторыях. Гэта магла быць аўтаномная ваенна-палітычная адзінка ў складзе Маскоўскай дзяржавы, але ніякім чынам не паўнавартасная незалежная дзяржава.